Падтрымай "Вясну" на PATREON

Ніна Багінская і іншыя актывісты папоўнілі спіс пакараных за ўдзел у акцыі пратэсту 21 кастрычніка дапоўнена

22.11.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Ніна Багінская. Фота: Радыё Свабода.

Колькасць пакараных за ўдзел у несанкцыянаванай масавай акцыі «Маршы абураных беларусаў 2.0», якая адбылася 21 кастрычніка ў Мінску, працягвае расці. Так, роўна праз месяц, суд Першамайскага раёна сталіцы разгледзеў адміністратыўную справу 70-гадовай актывісткі **Ніны Багінскай**. Суддзя **Таццяна Ліннік** 21 лістапада вынесла пастанову ад прыцягненні актывісткі да адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры 50 базавых велічынь за парушэнне артыкула 23.34 КаАП РБ. Ніна Багінская на судзе не прысутнічала.

Таксама ўчора на 20 базавых велічынь была пакараная актывіста АГП з Акцябрскага **Алена Луцковіч.** Суддзя - **Людміла Гормаш**. Пратакол правапарушэння па арт. 23.34 КаАП быў складзены 9 лістапада ўчастковым інспектарам Акцябрскага РАУС Дзмітрыем Крумгольцам. 21 кастрычніка Луцковіч выйшла на "Марш абураных беларусаў 2.0" з плакатам «Беларуская армія – серыйны забойца».

23 лістапада адбудзецца суд над **Верай Вакуловіч** за ўдзел у акцыі 21 кастрычніка. Пачаіак у 9.30, суд Ленінскага раёна Мінска.

28 лістапада суд Савецкага раёна Мінска пачне разгляд адміністратыўнай справы ў дачыненні да актывіста Беларускага нацыянальнага кангрэсу **Арцёма Бабка** таксама ў за ўдзел у акцыі 21 кастрычніка. Пачатак судовага паседжання ў 10-15.


На 23 лістапада ў судзе Мазырскага раёна прызначаны разгляд адміністратыўнай справы мясцовага жыхара **Уладзіміра Неўмяржыцкага**, які да гэтага часу нават не меў магчымасці азнаёміцца з пратаколам правапарушэння.

За месяц, які прайшоў з моманту правядзення “Марша абураных беларусаў-2.0” суды пакаралі арыштамі альбо штрафамі больш за 20 удзельнікаў акцыі пратэсту 21 кастрычніка з розных гарадоў Беларусі.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы


Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"


"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля райда па сяброўках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY